**А.І.Салохіна,**
*дацэнт*
**Н.А.Валынец,**
*ст. выкладчык*

# ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ШПАЛЕРЫ І ЯЕ АДНАЎЛЕННЯ

Гісторыя прафесійнага беларускага габелена пачынаецца ў XVII—XVIII стст. Тады бязворсавыя дыванынакарціны (шпалеры) выраблялі на ткацкіх мануфактурах князёў Радзівілаў у Міры, Карэлічах, Нясвіжы, Альбе, Камянцы; князёў Агінскіх у Слоніме; на Гродзенскіх каралеўскіх мануфактурах, заснаваных Антонам Тызенгаўзам. Вядомы так званыя хатнія габелены Алізараў на Палессі.

Каб узнавіць карціну жыцця беларусаў у XVIII—XIX стст., зразумець, на якой глебе і менавіта як узніклі знакамітыя радзівілаўскія тапісерыі і дзякуючы якім асобам яны з'явіліся, перажылі росквіт і прыйшлі да заняпаду, неабходна звярнуцца да роду Радзівілаў.

З заканчэннем войнаў у другім дзесяцігоддзі XVIII ст. паўночна-ўсходнія землі Рэчы Паспалітай зрабіліся арэнай незвычайнага гаспадарчага ажыўлення. Пасля Паўночнай вайны быў падпісаны мір (1721), які даў магчымасць для нармальнага развіцця ініцыятывы ўласнікаў вялікіх маёнткаў. Абаронцамі інтэнсіўнага стварэння майстэрняў, мануфактур і мадэрнізацыі ўжо існуючых фабрык былі мясцовыя магнаты. Іх цікавіла (па прыкладу заходнееўрапейскага мастацтва) адраджэнне промыслаў і рамёстваў. Напэўна, галоўную ролю тут адыграў прыклад Францыі часоў Людовіка XIV, якая ў сярэдзіне XVIII ст. імкнулася да незалежнасці свайго рамяства ад імпарту з Італіі і Фландрыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікая заслуга ў гэтай справе належыць уладарам значнай часткі Літвы і Беларусі, Радзівілам і Агінскім. Асобную ролю ў індустрыялізацыі гэтых зямель адыграў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Створаныя ў XVIII ст. асновы тэкстыльнай, керамічнай, шкляной прамысловасці вытрымалі выпрабаванне часам і існавалі да XIX ст. Сярод мецэнатаў і апекуноў рамёстваў вылучаюцца Радзівілы. У XVII ст. яны стваралі галерэі і кунсткамеры з вырабаў заходняга мастацтва, а ў XVIII ст. тры пакаленні гэтай сям'і заснавалі і ўтрымлівалі самую вялікую калекцыю з тагачасных прадметаў айчыннага рамяства.

Пра Нясвіж і Радзівілаў напісана шмат. Легендамі і паданнямі ахутана гісторыя гэтага роду. Радзівілы мелі выключнае права на збіранне і захаванне ў Нясвіжскім замку дзяржаўнага архіва — так званай Літоўскай метрыкі. Радзівілы істотна ўплывалі на ўнутраную і знешнюю палітыку Вялікага княства Літоўскага, а затым Рэчы Паспалітай. Палітычная ўлада, якую мелі Радзівілы ў XVI—XVII стст., падмацоўвалася ваеннай і эканамічнай магутнасцю.

Нясвіж пад уладай Радзівілаў быў адным з буйнейшых цэнтраў культуры Беларусі і ўсёй Усходняй Еўропы. Яго нават называлі «маленькім Парыжам», «некаранаванай сталіцай» Вялікага княства Літоўскага. Вось як пісаў пра гэты горад гісторык і археолаг Адам Кіркор: «Нясвіж сваімі багаццямі, бляскам, непаўторнасцю выдатных твораў навукі і мастацтва не толькі быў першым у цэлай Літоўскай Русі, але пераўзыходзіў шмат у чым другарадныя сталіцы. Князі Астрожскія, несумненна, былі багацейшымі за Радзівілаў, але Нясвіж заўсёды пераўзыходзіў Астрог, і пераўзыходзіў не разгулам, дзівацтвамі і ўсялякімі празмернасцямі барскага жыцця, але сваім эстэтычным бокам, сваімі рэдкімі зборамі, кабінетамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкай, карціннай галерэяй, тэатрам і г.д. Сярод разнастайных барскіх задумак было шмат пробліскаў вытанчанасці, гуманнасці, вышэйшых поглядаў, нарэшце, нават самаадданасці».

Без дэталёвага вывучэння арыгіналаў, сістэматызацыі і аналізу дайшоўшых да нашага часу архіўных матэрыялаў і музейных экспанатаў, якія маюць адносіны да гісторыі тапісерыйных майстэрань князёў Радзівілаў, а таксама шпалер, выраблены у гэтых майстэрнях, цяжка адрадзіць забытыя тэхналогіі тапісерыйнага мастацтва майстэрань у Нясвіжы, Карэлічах, Міры, Альбе, Камянцы. На жаль, буйнейшы Нясвіжскі архіў кн.Радзівілаў быў згублены ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Гісторыя не была літасцівай да Нясвіжа. Значныя страты панёс Нясвіжскі замак пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай. У 1772 г. была разрабавана Радзівілаўская скарбніца. Самую каштоўную частку рэчаў (творы старажытнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, зброю, вырабы з золата, серабра і каштоўных камянёў) адправілі ў Пецярбург, другую — у Смаленск. Нясвіжская бібліятэка Радзівілаў, якая да 1772 г. налічвала 20 тыс. тамоў, была вывезена ў Пецярбург. На той час там знаходзіўся і кніжны збор «бібліятэкі Бяльскай», якую сабрала Ганна Радзівіл (1676—1746) родам з Сангушкаў.

У час вайны 1812 г. з замка вывезлі каля сотні фурманак, гружаных трафеямі. Часткова быў вывезены архіў, а часткова яго знішчылі. Рэшткі нясвіжскіх калекцый трапілі ў 1839 г. у Эрмітаж у Пецярбургу, а нумізматычны кабінет апынуўся ў Харкаўскім універсітэце.

Рабаванні Нясвіжскага замка адбыліся ў пачатку 1919 г., калі на пэўнай частцы Беларусі ўсталявалася савецкая ўлада. Шмат нясвіжскіх каштоўнасцей было знішчана або згублена ў 1939 г. Чатыры разы на працягу верасня 1939 г. і чэрвеня 1941 г. Бюро ЦК КП(б)Б абмяркоўвала на сваіх

пасяджэннях, куды накіраваць каштоўнасці. У выніку зніклі бясцэнныя прадметы мастацтва, шпалеры, мэбля, касцюмы.

Былы «маленькі Парыж» неверагоднымі намаганнямі стараецца захаваць рэшткі той неацэннай спадчыны, што пакінуў на гэтай зямлі таленавіты род Радзівілаў.

Святар Акалатовіч, што служыць у Нясвіжскім касцёле, робіць усё магчымае, каб захаваць 102 саркафагі членаў сям'і Радзівілаў, пачынаючы з князя Мікалая Крыштафа Сіроткі і канчаючы князем Альбрэхтам, які памёр у 1935 г. Склеп у Нясвіжы — адзіны ва Усходняй Еўропе некрапаль сям'і Радзівілаў. Разрабаваныя каштоўнасці Нясвіжа «распаўсюдзіліся» па ўсім свеце. І ў мясцовым гісторыка-краязнаўчым музеі, як паведаміў яго дырэктар Міхаіл Мацэль, ёсць толькі адна сапраўдная рэч з замка Радзівілаў — падлогавы гадзіннік. Сабраць, вярнуць хаця б малую частку таго, што тут знаходзілася, — задача неверагоднай цяжкасці.

21 верасня 1994 г. у Нясвіжы ў час міжнароднага сімпозіума адбылося чарговае, трэцяе, пасяджэнне паўнамоцных прадстаўнікоў урадаў і экспертаў сумеснай беларуска-польскай кансультацыйнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны. Была выказана, абмеркавана і рэкамендавана для рэалізацыі прапанова аб'яднаць намаганні Беларусі і Польшчы ў справе кансервацыі, фрагментарнага аднаўлення і адаптацыі замкаў у Навагрудку і Крэве.

Паўстае задача выхаваць новае пакаленне высокаадукаваных мастакоў, здольных на базе глыбінных ведаў айчыннай гісторыі, культуры, народнага і свецкага мастацтва стварыць сучасны аўтарскі габелен з ужываннем забытых тэхнік, рэканструяваць страчаныя для Беларусі шпалеры князёў Радзівілаў, якія калісьці ўпрыгожвалі цудоўныя інтэр'еры Нясвіжскага замка — былую



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэзідэнцыю вялікіх князёў, наогул, адрадзіць і рэканструяваць беларускую шпалеру, слава аб якой некалі выходзіла далёка за межы краіны.

Дзесяць гадоў таму, у пачатку стварэння кафедры народных рамёстваў у Беларускім універсітэце культуры, існавала адзіная майстэрня габелена і мастацкага ткацтва, дзе студэнты вывучалі тэхналогіі мастацкага ткацтва і габелена. Паколькі у межах вучэбнай праграмы немагчыма было пашырана займацца эксперыментам, для найбольш таленавітых і зацікаўленых студэнтаў на базе майстэрні габелена была арганізавана студыя. Навучэнцы студыі разам з выкладчыкамі пачалі шукаць новыя камбінацыі перапляценняў і аўтарскія тэхнікі ў габелене і ўжываць іх у творчых і вучэбных работах. Потым узнікла зацікаўленасць студэнтаў у дасканалым вывучэнні тэхнік класічнай шпалеры XVII—XIX стст., якая стваралася ў Беларусі. Работа студыі прынесла пэўныя вынікі. У творчых работах будучых мастакоў пачалі з'яўляцца эксперыментальныя перапляценні, заснаваныя на спалучэнні тэхнік як народнай мастацкай тканіны, класічнай шпалеры, так і сучаснага габелена.

У 1996 г. ва універсітэце культуры была наладжана выстава эксперыментальнага тэкстылю з удзелам студэнтаў. На рэспубліканскай выставе-конкурсе Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі ў 1999 г. студэнткі кафедры народных рамёстваў Н.Аждзер (габелен "Цені мінулага"), Т.Новікава (міні-габелен "Вясна"), І.Шаўцова (габелен "Ранішні нацюрморт") атрымалі дыпломы і спецыяльныя стыпендыі. На рэспубліканскай выставе маладых мастакоў "Новыя імёны", арганізаванай Беларускім саюзам мастакоў у верасні 2000 г., студэнтка А.Кажанец атрымала дыплом II ступені за габелен "Усё паўторыцца". На V Рэспубліканскай выставе-конкурсе Спецыяльнага фонду



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прэзідэнта РБ па падтрымцы таленавітай моладзі (2001) студэнтка А.Белавусава атрымала дыплом і прэмію за габелен "Вясна ў гарах".

На Рэспубліканскай маладзёжнай выставе Беларускага саюза мастакоў у кастрычніку 2002 г. першую прэмію за габелен "Джаз" атрымала студэнтка М.Барысенка.

Узнікла неабходнасць сістэматызаваць і навукова абгрунтаваць новыя распрацоўкі, тэхнікі і тэхналогіі, якія існавалі ў майстэрні габелена за 10 гадоў. З'явілася неабходасць у стварэнні навуковай лабараторыі з пашыранымі магчымасцямі.

Вось так і ўзнікла у 2001 г. на кафедры народных рамёстваў БДУкультуры навукова-творчая лабараторыя "Народныя рамёствы беларусаў", у якой знайшлося месца і для габелена.

У снежні 2002 г. супрацоўнікамі лабараторыі была арганізавана экспедыцыя па Беласточчыне, якая прынесла пэўныя вынікі па зборы этнаграфічнага матэрыялу на тэрыторыі былой Беларусі. У гэты ж час у Цэнтры беларускай культуры, у Гайнаўцы, была наладжана выстава творчых работ студэнтаў, выпускнікоў і выкладчыкаў кафедры народных рамёстваў (цяпер кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва) БДУ культуры. У экспазіцыі выставы было больш за 30 габеленаў, выкананых у розных тэхніках.

Выстава выклікала пэўную цікавасць як з боку сродкаў масавай інфармацыі, так і з боку наведвальнікаў — прадстаўнікоў беларускай дыяспары і палякаў.

Абазначаны мэты і задачы лабараторыі: вывучэнне і абагульненне сабранага эксперыментальнага матэрыялу; распрацоўка новых тэхналогій ткацтва і апрацоўкі габелена; пошук і ўзнаўленне страчаных тэхналогій тапісерыйнага мастацтва Беларусі XVII—XIX стст.; падрыхтоўка спецыялістаў, здольных рэканструяваць страча-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя для Беларусі шпалеры, створаныя ў тапісярнях князёў Радзівілаў, на мануфактурах Агінскіх, графа Тызенгаўза і інш. У працэсе ажыццяўлення гэтых мэт і задач адкрываюцца новыя перспектывы дзейнасці лабараторыі.

**У.У.Трамбіцкі,**
*ст.выкладчык*

## УПЛЫЎ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ НА СВЯДОМАСЦЬ АСОБЫ

Праблема асобы заўсёды знаходзіцца ў цэнтры навуковага і мастацкага асэнсавання. У сучасных умовах праблема асобы, роля яе ў жыцці дзяржавы і грамадства выклікае павышаную цікавасць філосафаў, псіхолагаў, педагогаў, біёлагаў, гісторыкаў, археолагаў, палеантолагаў, мастакоў і літаратараў. Прадстаўнікі многіх навук займаюцца вывучэннем такіх аспектаў праблемы, як суадносіны нерацыянальнага і рацыянальнага, свядомага і несвядомага, філагенезу і антагенезу, генетычнага і сацыяльнага. Але амаль не існуе прац, у якіх бы асоба разглядалася не як аб'ект даследавання, а як суб'ект сучаснай інфармацыйнай цывілізацыі.

У апошні час адбылося шмат перамен у розных сферах чалавечай дзейнасці. Цяпер нікому не трэба даказваць, што многія камп'ютэрныя і іншыя інфармацыйныя тэхналогіі здольныя дапамагаць асобе як у захаванні, так і ў перадачы інфармацыі на вялікія адлегласці. Чалавецтва апынулася перад неабходнасцю выпрацоўкі прынцыпова новай парадыгмы жыцця: дасягненні ў галіне інфармацыйных тэхналогій пачынаюць уплываць на чалавека і грамадства, дапамагаюць рэалізаваць асобе самыя фантастычныя прадбачанні футуролагаў. Не так даўно



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ